
СПЯВАНЫЯ ЧАСТКІ
СЬВЯТОЙ ІМШЫ
З ПЕСЬНЯМІ

МАЛІТВА ПАНСКАЯ

ОЙЧА НАШ, КАТОРЫ ЁСЦЬ У НЕБЕ,
СЬВЯТЫМ БУДЗЬ ІМЯ ТВАЁ,
ПРЫЙДЗІ ВАЛАДАРСТВА ТВАЁ,
БУДЗЬ ВОЛЯ ТВАЯ ЯК У НЕБЕ,
ТАК І НА ЗЯМЛІ.
ХЛЕБА НАШАГА ШТОДЗЁННАГА
ДАЙ НАМ СЁНЬНЯ.
І АДПУСЬЦІ НАМ ГРАХІ НАШЫ
ЯК І МЫ АДПУСКАЕМ
ВІНАВАТЫМ НАШЫМ.
І НЯ ЎВОДЗЬ НАС У СПАКУСУ,
АЛЕ ЗБАЎ НАС АД ЗЛОГА.
АМЭН.

АНЁЛЬСКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ

ВІТАЙ, МАРЫЯ, ПОЎНАЯ ЛАСКІ;
ПАН З ТАБОЮ.
БЛАСЛАЎЛЁНАЯ ТЫ
МІЖ ЖАНЧЫНАМІ
І БЛАСЛАЎЛЁНЫ ПЛОД УЛОНЬНЯ
ТВАЙГО, ЕЗУС.
СЬВЯТАЯ МАРЫЯ, МАЦІ БОЖАЯ,
МАЛІСЯ ЗА НАС, ГРЭШНЫХ,
ЦЯПЕР І Ў ХВІЛІНУ
СЬМЕРЦІ НАШАЙ.
АМЭН.

ПРАСЛАЎЛЕНЬНЕ СЬВЯТОЙ ТРОЙЦЫ

ХВАЛА АЙЦУ І СЫНУ,
І ДУХУ СЬВЯТОМУ.
ЯК БЫЛО СПРАДВЕКУ,
ЦЯПЕР І ЗАЎСЁДЫ
І НА ВЕКІ ВЯКОЎ.
АМЭН.

АПОСТАЛЬСКІ СКЛАД ВЕРЫ

ВЕРУ Ў БОГА,
АЙЦА ЎСЕМАГУТНАГА,
ТВОРЦУ НЕБА І ЗЯМЛІ.
І Ў ЕЗУСА ХРЫСТУСА,
СЫНА ЯГО АДЗІНАГА,
ПАНА НАШАГА,
ЯКІ БЫЎ ПАЧАТЫ
АД ДУХА СЬВЯТОГА,
НАРАДЗІЎСЯ З ПАННЫ МАРЫІ;
ЗАМУЧАНЫ ПРЫ
ПОНЦКІМ ПІЛАЦЕ,
УКРЫЖАВАНЫ, ПАМЁР
І БЫЎ ПАХАВАНЫ;
ЗЫШОЎ У ПЕКЛА,
ТРЭЦЯГА ДНЯ ЎСТАЎ ЗЬ МЁРТВЫХ,
УЗЫШОЎ НА НЕБА,
СЯДЗІЦЬ ПРАВАРУЧ
АЙЦА ЎСЕМАГУТНАГА;
АДТУЛЬ ПРЫЙДЗЕ
СУДЗІЦЬ ЖЫВЫХ І ПАМЁРШЫХ.
ВЕРУ Ў ДУХА СЬВЯТОГА,
СЬВЯТЫ КАТАЛІЦКІ КАСЬЦЁЛ,
АДПУШЧЭНЬНЕ ГРАХОЎ,
З МЁРТВЫХ ПАЎСТАНЬНЕ,
ЖЫЦЬЦЁ ВЕЧНАЕ.
АМЭН.

СПЯВАНЫЯ ЧАСТКІ СЬВЯТОЙ ІМШЫ З ПЕСЬНЯМІ

МАГУТНЫ БОЖА

1. МА_ ГУ_ ТНЫ БО_ ЖА! УЛА_ ДАР СУСЬ_ ВЕ_ ТАЎ, ВЯ_ ЛІ_ КІХ
СОН_ ЦАЎ І СЭРЦ МА_ ЛЫХ. НАД БЕ_ ЛА_ РУ_ СЯЙ ЦІ_ ХАЙ І
ВЕ_ ТЛАЙ РАС_ СЫП ПРА_ МЕНЬ_ НІ СВА_ Е ХВА_ ЛЫ.

ДАЙ СПОР У ПРАЦЫ
ШТОДЗЁННАЙ, ШЭРАЙ,
НА ЛУСТУ ХЛЕБА,
НА РОДНЫ КРАЙ,
ПАВАГУ, СІЛУ І ВЕЛІЧ ВЕРЫ
А НАШУ ПРАЎДУ,
У ПРЫШЛАСЬЦЬ ДАЙ!

ДАЙ УРАДЛІВАСЦЬ
ЖЫТНЁВЫМ НІВАМ,
УЧЫНКАМ НАШЫМ
ПАШЛІ ЎМАЛОТ!
ЗРАБІ МАГУТНАЙ,
ЗРАБІ СЧАСЬЛІВАЙ
КРАІНУ НАШУ І НАШ НАРОД!

БОЖА, БОЖА

БО_ ЖА, БО_ ЖА, ТЫ ШТО ЗЬ НЕ_ БА ПРЫ_ НЁС ЛЮ_ ДЗЯМ
СУ_ ПА_ КОЙ. МІ_ РУ МНЕ ТВАЙ_ ГО ПА_ ТРЭ_ БА,
У ДУ_ ШУ МНЕ ЎЛІ МІР ТВОЙ, У ДУ_ ШУ МНЕ ЎЛІ МІР ТВОЙ.

БОЖА, ВЯЧЫСТАЙ ДАБРАЦЕ АДДАНЫ

БО_ ЖА ВЯ_ ЧЫ_ СТАЙ ДА_ БРА_ЦЕ АД_ ДА_ НЫ.
НІ_ ВОД_ НАЙ МО_ ВАЙ НЕ ПЕ_ РА_ СКА_ ЗА_ НЫ.
ГО_ ДЗЕН, ТЫ, БО_ ЖА, ГО_ ДЗЕН, ТЫ, БО_ ЖА, ХВАЛЬ_БЫ У_ СЯ_ ЛЯ_ КАЙ.
СЛА_ ВЫ, ПА_ ША_ НЫ, СЛА_ ВЫ, ПА_ ША_ НЫ І ШЧЫ_РАЙ ПА_ ДЗЯ_ КІ.

НА ТВАР УПАЎШЫ

1. НА ТВАР У_ ПАЎ_ ШЫ ЗЬ МЕ_ СЦА СЬВЯ_ ТО_ ГА
ЧЭСЦЬ І МА_ ЛІ_ ТВУ ШЛЁМ МЫ ДА БО_ ГА,
З ПА_ КО_ РАЙ У СЭР_ ЦЫ, ДУ_ ШОЙ У_ ДЗЯ_ ЧНАЙ
ПРАД ХРЫ_ СТО_ ВАЙ А_ ХВЯ_ РЫ СТРА_ ШНАЙ.

ЦЯБЕ МЫ ПРОСІМ, ДАРАГІ БОЖА,
ХАЙ ТВАЯ ЛАСКА
НАМ ДАПАМОЖА:
ДАЙ СПАКОЙ ДОМА,
А ДАР Ў ПОЛІ,
НЯХАЙ ЗЯМЕЛЬКА
РОДЗІЦЬ ДАВОЛІ.

ШЛЁМ ДА ЦЯБЕ МЫ ПРОСЬБЫ,
ЖАДАНЬНІ,
ДАРУЙ У ПАТРЭБЕ
НАМ ЗЬМІЛАВАНЬНЕ.
ДАЙ, КАБ НА СЬВЕЦЕ
ТАБЕ СЛУЖЫЛІ,
А ПАСЬЛЯ У НЕБЕ ВЕЧНА ХВАЛІЛІ.

ДАЙ НАМ ЗДАРОЎЕ,
МІЛАСЦЬ І ЗГОДУ,
А ДУШЫ У ЧЫСТЦУ
ДАРЫ СВАБОДАЙ.
ХАЙ ТВАЯ ЛАСКА
ПЛЫВЕ НАД ДАРАМ
ПРАЗ НАЙСЬВЯЦЕЙШУ
КРЫЖА АХВЯРУ.

ГЛЯНЬ, ЦЯБЕ ПРОСІЦЬ
НАРОД ТВОЙ ВЕРНЫ
МІЛЫ, НАШ ЕЗУС,
БУДЗЬ МІЛАСЭРНЫ.
УСІХ НАС, БОЖА,
РАТУЙ АД ЗЬДЗЕКУ.
ВАЗЬМІ НЯШЧАСНЫХ
У СВАЮ АПЕКУ.

ПЕСЬНЯ РАНІШНЯЯ

1. ЛЕДЗЬ У_ ЗОЙ_ ДЗЕ ЗА_ РА_ НІ_ ЦА, ЦЯ_ БЕ МО_ РА І ЗЯМ_ ЛІ_ ЦА,
ЦЯ_БЕ ХВА_ ЛІЦЬ УСЁ ЖЫ_ ВО_ Е, ПЯ_ Е КО_ ЖНЫ СВА_ІМ СТРО_ ЕМ.

Я Ж, ШТО СТВОРАНЫ ТАБОЮ,
ЗЛУЧАНЫ ЖЫЦЬЦЁМ З ЗЯМЛЁЮ,
ЦІ Ж ТАКІ НЯГОДНЫ БЫЎ БЫ,
КАБ ЦЯБЕ ДЫ НЕ ХВАЛІЎ БЫ!

ЛЕДЗЬ ПАСЬПЕЮ ПАДНЯЦЬ ВОЧЫ.
І ЎСТАЦЬ З ЛОЖКА ПАСЬЛЯ НОЧЫ,
ДА БОГА Ў НЕБЕ УЗДЫХАЮ,
ЯМУ ХВАЛУ ЗАСЫЛАЮ.

ШМАТ, ХТО ЎЧОРА ПАЛЯГЛІ СПАЦЬ
СЁНЬНЯ РАНА НЕ ЗМАГЛІ ЎСТАЦЬ,
МЫ ЯШЧЭ ЗДАРОВЫ ЎСТАЛІ,
КАБ МОЦ БОЖУ ВЫХВАЛЯЛІ.

БОЖА Ў ТРОЙЦЫ НЕПАНЯТЫ,
ОЙЧА, СЫНЕ, ДУХУ СЬВЯТЫ!
ТАБЕ ХВАЛУ АДДАВАЕМ,
ПАСЬВЯЦІ НАС, УПРАШАЕМ.

ПЕСЬНЯ ПРЫ ПРАЦЫ

МІЛАСЭРДНЫ ВЕЧНЫ БОЖА!
ЦЯБЕ ПРОСІМ КОЛЬКІ ЗМОЖАМ;
ТЫ ЗЬВЯРНІ ЛАСКАВЫ ВОЧЫ
НА ТВОЙ БЕДНЫ ЛЮД РАБОЧЫ.

ДАЙ НАМ МОЦНУ Ў ЦЯБЕ ВЕРУ,
У ЖАДАНЬНЯХ ДАЙ ЗНАЦЬ МЕРУ.
УРАДЖАЙ НАМ ДАЙ НА ПОЛІ,
ЗБАЎ НАС, БОЖА, АД НЯВОЛІ.

ДАЙ НАМ СІЛЫ НА ЗМАГАНЬНЕ!
ХАЙ ШЧАСЛІВЫ КОЖНЫ СТАНЕ,
АДВЯРНІ АД НАС ПРЫГОДЫ
ЗАХАВАЙ АД КОЖНАЙ ШКОДЫ.

НЕ ПАКІНЬ ЖА НАС НАВЕКІ,
БОЖА, БЕЗ ТВАЕ АПЕКІ;
ВЫБАЧАЙ НАМ НАШУ СЛАБАСЬЦЬ
І ЗГАТУЙ НЯБЕСНУ РАДАСЬЦЬ.

ЦЯБЕ, ОЙЧА, НАШ СТВАРЫЦЕЛЬ,
СЫНЕ БОЖЫ АДКУПІЦЕЛЬ,
ДУХУ ПАЦЯШЫЦЕЛЬ, БОЖА,
ВЫСЛАЎЛЯЕМ, КОЛЬКІ ЗМОЖАМ.

ХВАЛІЦЕ ЎСЕ НАРОДЫ

ХВА_ ЛІ_ ЦЕ ЎСЕ НА_ РО_ ДЫ, ХВА_ ЛІ_ ЦЕ ПА_ НА!
LAU_ DA_ TE OM_NES GEN_ TES, LAU_ DA_ TE DO_ MI_ NUM!
ХВА_ ЛІ_ ЦЕ ЎСЕ НА_ РО_ ДЫ, ХВА_ ЛІ_ ЦЕ ПА_ НА!
LAU_ DA_ TE OM_NES GEN_ TES, LAU_DA_ TE DO_MI_ NUM!

пры ўваходзе сьвятара людзі ўстаюць

АБРАД УСТУПНЫ

С: У І_ МЯ АЙ_ ЦА І СЫ_ НА І ДУ_ ХА СЬВЯ_ТО_ ГА.
Л: А_ МЭН.

С: ЛАСКА ПАНА НАШАГА ЕЗУСА ХРЫСТУСА, І ЛЮБОЎ БО_ ГА АЙ_ ЦА І ЎЧАСЬЦЕ ДУ_ ХА СЬВЯТОГА НЯХАЙ БУДЗЕ З УСІМІ ВА_МІ

Л: І З ДУ_ХАМ ТВА_ІМ.

АЛЬБО

С: ПАН З ВА_МІ

Л: І З ДУ_ХАМ ТВА_ІМ

СПАВЯДАЮСЯ БОГУ ЎСЕМАГУТНАМУ І ВАМ, БРАТЫ І СЁСТРЫ,
ШТО ЗГРАШЫЎ Я ВЕЛЬМІ ДУМКАЮ, СЛОВАМ, УЧЫНКАМ І НЯДБАЙНАСЦЮ.
МАЯ ВІНА, МАЯ ВІНА, МАЯ ВЕЛЬМІ ВЯЛІКАЯ ВІНА.
ТАМУ ПРАШУ НАЙСЬВЯЦЕЙШУЮ ЗАЎСЁДЫ ПАННУ МАРЫЮ, УСІХ АНЁЛАЎ І СЬВЯТЫХ, І ВАС, БРАТЫ І СЁСТРЫ, ПАМАЛІЦЦА ЗА МЯНЕ, ДА ПАНА БОГА НАШАГА.
С. НЯХАЙ ЗЬМІЛУЕЦЦА НАД НАМІ ЎСЕМАГУТНЫ БОГ І, АДПУСЬЦІЎШЫ НАМ ГРАХІ, ДАВЯДЗЕ ДА ЖЫЦЬЦЯ ВЕЧНАГА.
АМЭН.

1, 3. ПА_ НЕ, ЗЬМІ_ЛУЙ_СЯ, ПА_ НЕ, ЗЬМІ_ЛУЙ_СЯ, ПА_ НЕ, ЗЬМІ_ ЛУЙ_ СЯ НАД НА_ МІ.
2. ХРЫ_ СЬЦЕ! ХРЫ_ СЬЦЕ ХРЫ_ СЬЦЕ

альбо

ПА_ НЕ, ЗЬМІ_ЛУЙ_СЯ НАД НА_ МІ. ПА_ НЕ, ЗЬМІ_ЛУЙ_СЯ НАД НА_ МІ.
ХРЫСЬ_ЦЕ, ЗЬМІ_ЛУЙ_СЯ НАД НА_ МІ, ХРЫСЬ_ЦЕ, ЗЬМІ_ЛУЙ_ СЯ НАД НА_ МІ.
ПА_ НЕ, ЗЬМІ_ЛУЙ_СЯ НАД НА_ МІ. ПА_ НЕ, ЗЬМІ_ЛУЙ_ СЯ НАД НА_ МІ.

У нядзелю і сьвяты

Хвала на вы-шы-нях Бо-гу, А на зям-лі су-па-кой людзям добрай волі.

Хвалім Ця-бе, бласлаў-ля-ем Ця-бе. Кланя-ем-ся Та-бе. Услаў-ля-ем Ця-бе.

Дзяку-ем Та-бе дзеля вя-лі-кай хва-лы ва-ёй. Па-не Бо-жа, Ва-ла-да-

ру ня-бе-сны, Бо-жа Ай-ца ўсе-ма-гу-тны, Па-не Сы-не Ад-зі-на-род-ны

Е-зу-се Хрысьце, Па-не Бо-жа, Я-гнё Бо-жа-е, Сы-не Ай-ца,

Я-кі ўзяў на ся-бе гра-хі сьве-ту, зьмілуйся над намі. Які ўзяў на ся-бе

гра-хі сьве-ту, пры-мі ма-леньні на-шы-я, Я-кі ся-дзіш пра-ва-руч Ай-

ца зьмілуйся над на-мі. Бо толькі Ты ёсьць Сьвя-ты, толькі Ты ёсьць Па-нам,

толькі Ты найвы-шэйшы, Е-зу-се Хрысьце, з Духам Сьвятым у хвале Бога Айца. Амэн.

ЛІТУРГІЯ СЛОВА

пасьля малітвы сьвятара

Л: АМЭН

людзі сядаюць

першае чытаньне...

С. ВОСЬ СЛОВА БОЖАЕ.

Л. ДЗЯКУЕМ БОГУ.

псальм...

другое чытаньне ў нядзелю і сьвяты

С. ВОСЬ СЛОВА БОЖАЕ.

Л. ХВАЛА ТАБЕ, ХРЫСЬЦЕ.

людзі ўстаюць і сьпяваюць «АЛЕЛЮЯ»

АЛЬЛЕЛЮЯ




АЛЬ-ЛЕ-ЛЮ-Я. АЛЬ-ЛЕ-ЛЮ-Я. АЛЬ-ЛЕ-ЛЮ-Я.



ПАН З ВА_ МІ, І З ДУ_ ХАМ ТВА_ ІМ ЧЫТАНЬНЕ СЬВЯТОГА ЕВАНГЕЛЬЛЯ



ПА_ ВОД_ ЛЕ СЬВЯ_ ТО_ ГА N ХВА_ ЛА, ТА_ БЕ, ХРЫСЬ_ ЦЕ




ВОСЬ СЛО_ ВА ПАН_ СКА_ Е ХВА_ ЛА, ТА_ БЕ, ХРЫСЬ_ ЦЕ.

людзі сядаюць


ЕВАНГЕЛЬЛЕ...

людзі ўстаюць
у нядзелю і сьвяты

КАЗАНЬНЕ...



ВЕ_ РУ Ў А_ ДЗІ_ НА_ ГА БО_ ГА АЙ_ЦА ЎСЕ_ МА_ ГУТ_ НА_ ГА, ТВОР_ЦУ НЕ_ БА



І ЗЯМ_ ЛІ ЎСЯ_ ГО БАЧ_ НА_ ГА І НЯ_ БАЧ_ НА_ ГА.

ВЕРУ Ў АДЗІНАГА БОГА АЙЦА ЎСЕМАГУТНАГА, ТВОРЦУ НЕБА І ЗЯМЛІ,
УСЯГО БАЧНАГА І НЯБАЧНАГА
І Ў АДЗІНАГА ПАНА ЕЗУСА ХРЫСТА, СЫНА БОЖАГА, АДЗІНАРОДНАГА,
АД АЙЦА НАРОДЖАНАГА ПЕРАД УСІМІ ВЯКАМІ,
БОГА АД БОГА, СЬВЯТЛО АД СЬВЯТЛА,
БОГА САПРАЎДНАГА АД БОГА САПРАЎДНАГА,
НАРОДЖАНАГА, НЯСТВОРАНАГА, АДЗІНАСУТНАГА АЙЦУ
ПРАЗ ЯКОГА ЎСЁ СТАЛАСЯ.
ЁН ЖА ДЗЕЛЯ НАС, ЛЮДЗЕЙ І ДЗЕЛЯ НАШАГА ЗБАЎЛЕНЬНЯ
ЗЫШОЎ ЗЬ НЕБА
І ПРЫНЯЎ ЦЕЛА ЗА СПРАВАЙ ДУХА СЬВЯТОГА З ПАННЫ МАРЫІ
І СТАЎ ЧАЛАВЕКАМ.
УКРЫЖАВАНЫ ТАКСАМА ЗА НАС ПРЫ ПОНЦКІМ ПІЛАЦЕ,
ЦЯРПЕЎ І БЫЎ ПАХАВАНЫ,
І НА ТРЭЦІ ДЗЕНЬ УВАСКРОС, ПАВОДЛЕ ПІСАНЬНЯ,
УЗЫШОЎ НА НЕБА І СЯДЗІЦЬ ПРАВАРУЧ АЙЦА
І ЗНОЎ ПРЫДЗЕ Ў ХВАЛЕ СУДЗІЦЬ ЖЫВЫХ І ПАМЁРШЫХ

І ЯГО ВАЛАДАРСТВУ НЯ БУДЗЕ КАНЦА.
ВЕРУ Ў ДУХА СЬВЯТОГА, ПАНА ЖЫВАТВОРЧАГА,
ЯКІ АД АЙЦА І СЫНА ПАХОДЗІЦЬ.
ЯКОМУ РАЗАМ З АЙЦОМ І СЫНАМ ТАКСАМА НАЛЕЖЫЦЬ ПАКЛАНЕНЬНЕ
І ХВАЛА, ЯКІ ПРАМАЎЛЯЎ ПРАЗ ПРАРОКАЎ.
ВЕРУ Ў АДЗІНЫ СЬВЯТЫ, КАТАЛІЦКІ І АПОСТАЛЬСКІ КАСЬЦЁЛ.
ПРЫЗНАЮ АДЗІНЫ ХРОСТ ДЛЯ АДПУШЧЭНЬНЯ ГРАХОЎ.
І ЧАКАЮ ЎВАСКРАШЭНЬНЯ ПАМЁРШЫХ
І ЖЫЦЬЦЯ ВЕЧНАГА Ў БУДУЧЫМ СЬВЕЦЕ. АМЭН.

ЭЎХАРЫСТЫЧНАЯ ЛІТУРГІЯ

людзі сядаюць

ДАЙ, ДОБРЫ БОЖА

1. ДАЙ, ДОБ_РЫ БО_ ЖА, ЗА_РУЙ СОН_ЦА БА_ ЧЫЦЬ, ТВА_ Ё_ Ю ЛА_ СКАЙ ЗА_ХА_ ВАЙ АД ГРЭ_ ХУ. К ТА_ БЕ ЎЗДЫ_ХА_ Е МА_ Ё СЭР_ЦА ПЛА_ ЧЫЦЬ—ДАЙ У ТВА_ЁЙ СІ_ ЛЕ МНЕ ЗНАЙСЬЦІ ПА_ЦЕ_ ХУ.

ТЫ СЬВЕТ УЛАДЗІЎ
НА ЛЮДЗКУЮ СЛУЖБУ —
ТАКІ КАРЫСНЫ І ТАКІ ПРЫГОЖЫ,
КАБ МЫ, ЎВАЙШОЎШЫ З ГЭТЫМ
СЬВЕТАМ Ў ДРУЖБУ,
ЦЯБЕ ХВАЛІЛІ,
НАЙЛЕПШЫ НАШ БОЖА!

ТАБЕ МАЛЮСЯ,
БОЖА МІЛАСЬЦІВЫ,
ДАЙ МНЕ ЎБАЧЫЦЬ СЬВЕТ
ТВОЙ НАЙЯСЬНЕЙШЫ —
ЦЯБЕ САМОГА І ЎСЕ Ў НЕБЕ ДЗІВЫ
НА ВЕКІ ВЕЧНЫ,
БОЖА НАЙМІЛЕЙШЫ!

ТВАЁЮ МОЦАЙ І Я
МОЦНЫ СТАНУ —
АЙЦА І СЫНА,
І ДУХА СЬВЯТОГА —
ТРОЙЦУ АДЗІНУ,
КАЛІ Ў НЕБА ГЛЯНУ,
ХВАЛІЦІ БУДУ СТВАРЫЦЕЛЯ БОГА.

БУДЗЬ ХВАЛА БОГУ,
У ТРОЙЦЫ ЎСЕМАГУТНАЙ
І ЖЫВАТВОРЧАЙ,
ВЕЧНАЙ НА ЗАЎСЁДЫ
І НЕРАЗЬДЗЕЛЬНАЙ
І АДЗІНАСУТНАЙ,
У БОЖАЙ МОЦЫ,
ЗНАК ЛЮБЬВІ, ЗГОДЫ.

О, БОЖА СПАСЕ НАШ



С. БЛАСЛАЎЛЁНЫ ТЫ, ПАНЕ БОЖА СУСЬВЕТУ, БО, ДЗЯКУЮЧЫ ТВАЁЙ ШЧАДРАЦЕ, МЫ АТРЫМАЛІ ХЛЕБ, ПЛЁН ЗЯМЛІ І ПРАЦЫ РУК ЛЮДЗКІХ, ЯКІ МЫ АХВЯРУЕМ ТАБЕ, КАБ СТАЎСЯ ДЛЯ НАС ХЛЕБАМ ЖЫЦЬЦЯ.

Л. БЛАСЛАЎЛЁНЫ БОЖА, НА ЎСЕ ВЯКІ

С. МАЛІЦЕСЯ, БРАТЫ І СЁСТРЫ, КАБ МАЮ І ВАША АХВЯРУ ПРЫНЯЎ БОГ, АЙЦЕЦ УСЕМАГУТНЫ.

Л. НЯХАЙ ПАНЕ ПРЫМЕ АХВЯРУ З РУК ТВАІХ НА ЎШАНАВАНЬНЕ І ХВАЛУ ІМЯ СВАЙГО, А ТАКСАМА ДЗЕЛЯ КАРЫСЦІ НАШАЙ І ЎСЯГО КАСЬЦЁЛА СЬВЯТОГА.

сьвятарская малітва над дарамі
людзі ўстаюць

Л. АМЭН

МАЛІТВА ЭУХАРЫСТЫЧНАЯ



людзі кленчаць

адбываецца эўхарыстычная малітва

Л:

СЬВЯ_ТЫ, СЬВЯ_ТЫ, СЬВЯ_ТЫ ПАН БОГ МА_ГУ_ЦЫЯЎ! НЕ_БА І ЗЯМ_ЛЯ ПОЎ_НЫ_Я

ХВА_ ЛЫ ТВА_ ЁЙ! ГА_ САН_ НА, НА ВЫ_ ШЫ_НЯХ! БЛА_СЛАЎЛЁНЫ ТОЙ,

ХТО ПРЫХОДЗІЦЬ У ІМЯ ПАН_СКА_ Е! ГА_САН_ НА, НА ВЫ_ ШЫ_ НЯХ!

пасьля паднясеньня

С. ВОСЬ ТА_ЯМ_ НІ_ЦА ВЕ_ РЫ! Л. АБ_ ВЯ_ШЧА_ ЕМ СЬМЕРЦЬ ТВАЮ ПА_ НЕ,

ВЫ_ЗНА_ЁМ ТВА_ Ё Ў_ ВА_СКРА_ШЭНЬ_ НЕ, І ЧА_ КА_ЕМ ТВАЙГО ПРЫЙСЬЦЯ Ў ХВАЛЕ

на заканчэньне эўхарыстычнай малітвы

С:

ПРАЗ ХРЫ_СТА З ХРЫ_СТОМ І Ў ХРЫ_СЬЦЕ, ТА_ БЕ, ЎСЕ_ МА_ ГУТ_ НЫ


БО_ ЖА ОЙ_ ЧА, У А_ ДЗІН_СТВЕ ДУ_ ХА СЬВЯ_ ТО_ ГА.

ЎСЯ ПАШАНА І ХВАЛА СПАКОН ВЯ_ КОЎ, ВЕЧ_ НА. Л: А_ МЭН.

АБРАД СЬВЯТОЙ КАМУНІІ

людзі ўстаюць







АД УСЯЛЯКАЙ ТРЫ_ВО_ ГІ, ПОЎ_ НЫЯ СПАДЗЯВАНЬНЕМ ЧА_ КА_ ЛІ

ПРЫЙ_ СЬЦЯ ЗБАЎЦЫ НАШАГА Е_ ЗУ_ СА ХРЫ_ СТУ_ СА.

Л: БО ТВА_ Ё ВА_ ЛА_ ДАР_СТВА І МОЦ І ХВА_ ЛА ВЕЧ_ НЫ_ Я.

С: ПА_ НЕ ЕЗУСЕ ХРЫСЬЦЕ, ТЫ ПРАМОВІЎ АПОСТАЛАМ СВАІМ:

СУПАКОЙ ПАКІДАЮ ВАМ, СУПАКОЙ МОЙ ДА_ Ю ВАМ.

ПРОСІМ ЦЯБЕ, НЕ ЗВАЖАЙ НА ГРАХІ НА_ ШЫ_ Я,

АЛЕ НА ВЕРУ КАСЬЦЁЛА СВАЙГО, І ЗГОД_ НА З ВО_ ЛЯЙ ТВА_ ЕЙ,

НАПАЎНЯЙ ЯГО СУПАКОЕМ І ПРЫВЯДЗІ ДА ПОЎНАЙ ЕД_ НА_ СЬЦІ

Я_ КІ ЖЫВЕШ І ВАЛАДАРЫШ НА ВЕ_ КІ ВЯ_ КОЎ Л: А_ МЭН.

С. СУПАКОЙ ПАНА НЯХАЙ БУДЗЕ З ВАМІ
Л. І З ДУХАМ ТВАІМ.

людзі клечаць

1. 2. 3. Я_ ГНЁ БО_ ЖА_Е, Я_ КІ АД_ПУ_СКА_ЕШ ГРА_ХІ СЬВЕТУ. ЗЬМІЛУЙСЯ НАД НАМІ.
ДАЙ НАМ СУПАКОЙ.


С. ВОСЬ ЯГНЁ БОЖАЕ, ЯКІ АДПУСКАЕ ГРАХІ СЬВЕТУ, БЛАСЛАЎЛЁНЫЯ, ПАКЛІКАНЫЯ НА ВЯЧЭРУ ЯГОНУЮ.

Л. ПАНЕ, Я НЯ ВАРТЫ, КАБ ТЫ ЎВАЙШОЎ ДА МЯНЕ, АЛЕ СКАЖЫ ТОЛЬКІ СЛОВА І АЧУНЯЕ ДУША МАЯ.

С. ЦЕЛА ХРЫСТА.

Л. АМЭН.

О, МОЙ БОЖА!



ТЫ САТВАРЫЎ, ТЫ АДКУПІЎ,
ТЫ НАС БОЖА І АСЬВЯЦІЎ;
ЗА ТОЕ ТАБЕ ДЗЕ ЁСЦЬ ЛЮДЗІ
ЧЭСЬЦЬ І ХВАЛА НЯХАЙ БУДЗЕ.

ТАБЕ, БОЖА, КЛАНЯЮСЯ,
НА ТВАЮ ВОЛЮ ЗДАЮСЯ,
А БЫЦЬ ХАЧУ ТОЛЬКІ Ў НЕБЕ,
ПА ЎСЕ ВЯКІ СЛАВІЦЬ ЦЯБЕ.

ЖАЛЬ МНЕ, БОЖА, ЗГРАШЫЎ ТАБЕ,
ПРАЗ ГРЭХ ДАСТАЎ ПЕКЛА САБЕ;
ДЫ НЯ ТАК ЖАЛЬ ЗГУБЫ МАЕЙ,
ЯК ЖАЛЬ, БОЖА, КРЫЎДЫ ТВАЕЙ!

АХ, МОЙ БОЖА, Я КАЮСЯ,
ДАРУЙ ВІНЫ — ПАПРАЎЛЮСЯ;
ДЫ ЎЖО СТО РАЗ ПАМЕРЦІ ВОЛЮ
НА ГРЭХ БОЛЕЙ НЕ ДАЗВОЛЮ.

ДЛЯ ТВАЙГО ЎСПАДАБАНЬНЯ
ХАЧУ СПАЎНЯЦЬ ПРЫКАЗАНЬНІ;
ЖЫЦЬ І ЎМІРАЦЬ ХАЧУ Ў ТАБЕ,
БО ТЫ ДОБРЫ САМ У САБЕ.

О, ЕЗУСЕ, ЗБАВІЦЕЛЮ
МІЛЫ НАШ ПАЦЯШЫЦЕЛЮ
ДА РУК ДА НОГ ТВАІХ ПАЎШЫ,
КАЕМСЯ ЗА ГРАХІ НАШЫ.

ЦАЛУЮЧЫ ТВАЕ РАНЫ,
О, ЕЗУСЕ, НАШ КАХАНЫ,
РУКІ Й ВОЧЫ К ТАБЕ ЎЗНОСІМ,
АДПУШЧЭНЬНЯ ГРАХОЎ ПРОСІМ.

СЬЛЁЗЫ НАШЫ ВЫЛІВАЕМ,
ШЧЫРЫМ СЭРЦАМ ПРЫРАКАЕМ:
ПАКУЛЬ БУДЗЕМ З ЛЮДЗЬМІ ЖЫЦІ,
НЯ БУДЗЕМ БОГУ ГРАШЫЦІ.

О, МАРЫЯ, МАЦІ БОЖА!
ТЫ СЬВЯТАЯ КВЕТКА РАЙСКА!
МАЛІСЯ БОГУ ЗА НАМІ
НЯГОДНЫМІ ГРЭШНІКАМІ.

УСЕ СЬВЯТЫЯ ЎЗГЛЯНЬЦЕ ЗЬ НЕБА!
ВАШАЙ ЛАСКІ НАМ ПАТРЭБА;
МАЛІЦЕСЯ ВЫ ЗА НАМІ,
НЯГОДНЫМІ ГРЭШНІКАМІ.

ХВАЛА БОГУ ПРАЎДЗІВАМУ,
ХВАЛА Ў ТРОЙЦЫ АДЗІНАМУ,
ХВАЛА АЙЦУ, РАЗАМ СЫНУ,
ХВАЛА Й ДУХУ СЬВЯТОМУ.

ПАД ТВАЕ ПРЫХОДЗІМ ДЗЬВЕРЫ



ЗРАЗУМЕЦЬ НАМ ТРУДНА ГЭТА,
КАБ СЫН БОЖЫ —
ЗБАУЦА СЬВЕТУ —
АЖ ТАК СКРЫЎСЯ ЎСІМ НА ДЗІВА
І Ў ГОСТЫІ ЖЫЎ ПРАЎДЗІВА.

МІЛАСЬЦЬ БОГА ЗАЯСЬНЕЛА,
ЯК ЗЬМЯНІЎ ХЛЕБ Ў СВАЁ ЦЕЛА —
НАМ ПАКІНУЎ СПАЖЫВАЦІ,
КАБ ПРАЗ ГЭТА НАС ЗБАЎЛЯЦІ.

НЕСЬМЯРОТНЫ, МОЦНЫ БОЖА,
ЗРАЗУМЕЦЬ ЦЯБЕ ХТО МОЖА?
ТЫ ДЛЯ ГРЭШНЫХ СПРАВЯДЛІВЫ
І ДЛЯ ДОБРЫХ МІЛАСЦІВЫ.

ХОЦЬ АНЁЛЫ Ў НЕБЕ БЛІЗКА,
ПРАД ТАБОЮ ПАЎШЫ НІЗКА,
УСЬЦЯЖ НА ТВАР
ТВОЙ СПАГЛЯДАЮЦЬ,
ЧЫМ ЁСЬЦЬ БОГ, АДНАК НЯ ЗНАЮЦЬ.

НАТ, АНЁЛАМ, БОГ СПРАДВЕКУ
ТАК НЯ ДАЎ, ЯК ЧАЛАВЕКУ!
ПРЫСТУПАЦЬ ДА БОГА СЬМЕЛА,
СПАЖЫВАЦЬ ЯГОНА ЦЕЛА.

Я ТАГО НЯГОДЗЕН, ПАНЕ,
КАБ ВА МНЕ МЕЎ ПРАБЫВАНЬНЕ —
СКАЖЫ ТОЛЬКІ АДНО СЛОВА,
І ДУШУ МНЕ ЗБАВІШ ЗНОВА.

БЬЮ ПАКЛОНЫ ПРАД ТАБОЮ,
ЛАСКУ МЕЙ НАД ГРЭШНЫМ МНОЮ.
ХАЙ ЖЫВЫ З ТАБОЮ, ПАНАМ,
АЖ НА ВЕКІ ВЕЧНЫ, АМЭН.

СУПЛІКАЦЫЯ



1. СЬВЯТЫ БОЖА, СЬВЯТЫ МОЦНЫ, СЬВЯТЫ НЕСЬМЯРОТНЫ ЗЬМІЛУЙСЯ НАД НАМІ { 3 р.
2. АД ПАЖАРУ, ГОЛАДУ, ВАЙНЫ І ЗАРАЗЫ, БАРАНІ НАС, БОЖА!
3. АД РАПТОЎНАЙ І НЕСПАДЗЯВАНАЙ СЬМЕРЦІ, СЬЦЕРАЖЫ НАС, БОЖА!
4. КАБ КАСЬЦЁЛ ТВОЙ СЬВЯТЫ КАТАЛІЦКІ БАРАНІЦЬ І УЗВЫШАЦЬ МЕЎ ЛАСКУ ЦЯБЕ ПРОСІМ, БОЖА!
5. КАБ АЙЦА СЬВЯТОГА І ЎСЕ ДУХОДНЫЯ СТАНЫ Ў НАБОЖНАЙ ЕДНАСЬЦІ ЗАХАВАЦЬ МЕЎ ЛАСКУ, ЦЯБЕ ПРОСІМ, БОЖА!
6. КАБ НАС У СЬВЯТОЙ СЛУЖБЕ ТВАЁЙ УМАЦАВАЦЬ МЕЎ ЛАСКУ, ЦЯБЕ ПРОСІМ, БОЖА!
7. КАБ НАС ДА ПАКУТЫ ШЧЫРАЙ ДАВЕСЬЦІ МЕЎ ЛАСКУ, ЦЯБЕ ПРОСІМ, БОЖА!
8. КАБ УРАДЖАЙ ДАЦЬ І ЯГО Ў ЦЭЛАСЬЦЬ ЗАХАВАЦЬ МЕЎ ЛАСКУ, ЦЯБЕ ПРОСІМ, БОЖА!
9. МЫ ГРЭШНЫ ЦЯБЕ БОГА, МОЛІМ, ПАСЛУХАЙ НАС, БОЖА!
10. О, ЕЗУС, ЕЗУС, ЕЗУС, ЗЬМІЛУЙСЯ НАД НАМІ!
11. О, МАРЫЯ, ДЗЕВА І МАЦІ БОЖА, ЗАСТУПІСЯ ЗА НАС!

1. СЬВЯТЫ БОЖА, СЬВЯТЫ МОЦНЫ, СЬВЯТЫ НЕСЬМЯРОТНЫ! ЗЬМІЛУЙСЯ НАД НАМІ!
2. АД ВАЙНЫ БРАТНЯЙ, ШТО ГРОМАМ НАС ТРЫВОЖА, СЬЦЕРАЖЫ НАС, БОЖА!
3. АД ПРАРОКА, ШТО ЗГУБУ НАМ ВАРОЖА, СЬЦЕРАЖЫ НАС, БОЖА!
4. АД БУРАЎ, ШТО ГРАДАМ БЬЮЦЬ У ПОЛІ ЗБОЖЖА, СЬЦЕРАЖЫ НАС, БОЖА!
5. І АД ЖЫЦЬЦЯ, ЯКІМ ЖЫЦЬ НАРОД НЯ МОЖА, СЬЦЕРАЖЫ НАС, БОЖА!
6. АД ЦЁМНАЙ МОЦЫ, ШТО ДУШУ НАМ ТРЫВОЖА, СЬЦЕРАЖЫ НАС, БОЖА!
7. МЫ ГРЭШНЫ, ЦЯБЕ, БОГА, МОЛІМ, ПАСЛУХАЙ НАС, БОЖА!
8. О, ЕЗУС, ЕЗУС, ЕЗУС, ЗЬМІЛУЙСЯ НАД НАМІ!
9. О, МАРЫЯ, ПАННА І МАЦІ БОЖА, ЗАСТУПІСЯ ЗА НАС!

АБРАД ЗАКАНЧЭНЬНЯ

людзі ўстаюць

С. ПАН З ВА_ МІ.
Л: І З ДУ_ ХАМ ТВА_ ІМ.
С: НЯ_ ХАЙ БЛАСЛАВІЦЬ ВАС ЎСЕ_ МА_ГУТ_ НЫ БОГ, АЙ_ ЦЕЦ І СЫН І + ДУХ СЬВЯ_ТЫ.
Л: АМЭН

С: І_ ДЗІ_ЦЕ Ў СУ_ПА_КО_ І ХРЫ_СТУ_ СА.
Л: ДЗЯ_ КУ_ЕМ ПА_ НУ БО_ ГУ.

пры адыходзе сьвятара людзі стаяць.

ПЕСЬНЯ ВЯЧЭРНЯЯ



КАЛІ ПАСЬНЁМ Ў НОЧЫ
МЕЙ НАД НАМІ ТВАЕ ВОЧЫ,
СЬЦЕРАЖЫ АД ЗЛОЙ ПРЫГОДЫ,
БАРАНІ АД КОЖНАЙ ШКОДЫ.

УСЕ НАШЫ ДЗЁННЫ СПРАВЫ
ПРЫЙМІ МІЛА, БОЖА ПРАВЫ.
ПАКІРУЙ НАМ НА ЗБАЎЛЕНЬНЕ,
ДЫ НА ТВАЁ ВЫСЛАЎЛЕНЬНЕ

ХАЙ ЗДАРОВЫ СА СНУ ЎСТАНЕМ
І СЛУЖЫЦЬ ТАБЕ ЗНОЎ СТАНЕМ:
ДУШОЙ, СЭРЦАМ, ЯК ХТО МОЖА,
ПРАЦАЙ НА ТВАЮ ЧЭСЦЬ, БОЖА!

БАРАНІ НАС АД ЗГРАШЭНЬНЯ,
КАБ НЯ СТРАЦІЛІ ЗБАЎЛЕНЬНЯ,
АЛЕ НЕБА ЎСЕ ДАСТАЛІ —
ЦЯБЕ ВЕЧНА ВЫХВАЛЯЛІ.

БЕЛАРУСКІ РЭЛІГІЙНЫ ГІМН



АСЬВЯЦІ НАШ РОЗУМ ВЕРАЙ
І НАДЗЕЮ Ў ДУШУ ЎЛІ,
ДЫ АГОНЬ ЛЮБОВІ ШЧЫРАЙ
У СЭРЦАХ НАШЫХ ЗАПАЛІ!
ДАЙ, КАБ ЗЕРНЯТКА ПРАБУДОВЫ
ЗАЛЯЦЕЛА Ў КОЖНЫ КУТ
БЕЛАРУСКІ, КАБ УСЮДЫ
УЗЫШЛО І ТАМ І ТУТ.

КАБ РУНЕЛА, ВЫПЛЫВАЛА,
КРАСАВАЛА, НАЛІЛО
І, НАСЬПЕЎШЫ, У ТОК НЯМАЛА
УМАЛОТУ ПРЫНЯСЛО.
ПАМАЖЫ Ж НАМ, БОЖА МІЛЫ,
ПРАБУДЗІЦЦА ДА ЖЫЦЬЦЯ,
УДЗЯЛІ ПАРАДЫ, СІЛЫ,
КАБ НЯ ЗЬБІЛІСЯ З ПУЦЬЦЯ.

ДЫК ЖЫВІ Ж ТЫ І КРАСУЙСЯ,
НАША МАЦІ, БЕЛАРУСЬ,
ДА КРАЁЎ ЧУЖЫХ РАЎНУЙСЯ,
ЙСЬЦІ ДЗЯЦЕЙ К САБЕ ПРЫМУСЬ.
ХАЙ БЯРУЦЦА ДА РАБОТЫ,
ДОМ НАРОДНЫ БУДАВАЦЬ,
І БАГАЦЦЯ Ў ЦНОТЫ,
КАБ ПАСЬЛЯ ІМ РАЙ ДАСТАЦЬ.

ПЕСЬНІ НА АСНОЎНЫЯ СЬВЯТЫ

НА БОЖАЕ НАРАДЖЭНЬНЕ

1. ПА_ КА_ ЗА_ ЛАСЬ З НЕ_ БА ЯС_ НАСЬЦЬ НЕ_БЫ_ ВА_ ЛА,
ГРА_МА_ ДА А_ НЁ_ ЛАЎ ПЕСЬ_НЮ ЗА_СЬПЯ_ ВА_ ЛА:

“ХВА_ ЛА БО_ ГУ НА ВЫ_ ШЫ_ НЯХ, СПА_ КОЙ ЛЮ_ ДЗЯМ НА НІ_ ЗІ_ НАХ.

GLO_ RI_A, GLO_ RI_A, GLO_ RI_A IN EXCELSIS DE_ O!

ПАСТУШКІ НА ПОЛЮ СА СТРАХУ ПАМЛЕЛІ,
ЯК НА ГЭТЫЯ ЦУДЫ Ў ПОЎНАЧ ГЛЯДЗЕЛІ

ТАДЫ АНЁЛ ІМ ЗЬЯВІЎСЯ,
МОВІЎ: «БОГ ВАМ НАРАДЗІЎСЯ»

GLORIA, GLORIA, GLORIA IN EXALSIS DEO!»
НАЙСЬВЯЦЕЙША ПАННА СТАЛА МАТКОЙ БОГА,

ШТО АДКУПІЦЬ ЛЮДЗКАСЬЦЬ З МОЦЫ ДУХА ЗЛОГА.
У СТАЙНІ І НАРАДЗІЛА,
І НА СЕНЦА ПАЛАЖЫЛА.
GLORIA, GLORIA, GLORIA IN EXCELSIS DEO!»
І ПАБЕГЛІ ДЗЕЦІ ЗЬ ВЯЛІКАЙ АХВОТАЙ,
ГРАЛІ І СЬПЯВАЛІ БОГУ СТРОЙНАЙ НОТАЙ;
СВАЕ СЭРЦЫ РАДАВАЛІ,
ШТО ЕЗУСА АГЛЯДАЛІ.
GLORIA, GLORIA, GLORIA IN EXCELSIS DEO!
І МЫ ЗАСЬПЯВАЙМА ПАНУ БОГУ ХВАЛУ;
ШТО ДЛЯ НАС РАДЗІЎСЯ І ЦЯПЕР НЯМАЛА;
ВЫСЛАЎЛЯЙМА ПАНА БОГА
У СЬВЯТОЙ ТРОЙЦЫ АДЗІНОГА.
GLORIA, GLORIA, GLORIA IN EXCELSIS DEO!

НА ВЯЛІКІ ПОСТ



ПРАЗ ЖЫДОЎ БЫЎ ЗАТРЫМАНЫ,
ДА СУДДЗЬДЗЯЎ ЯК
ЗЛОДЗЕЙ ГНАНЫ,
ВІНАВАЧАНЫ ФАЛЬШЫВА,
СУДЖАНЫ НЕСПРАВЯДЛІВА.

ЗДРАТАВАЛІ ТВАЁ ЦЕЛА,
ШТО НЯ БЫЛО ЧАСТКІ ЦЭЛАЙ,
РАНАМІ ЎСЯГО ПАКРЫЛІ.
НАЙСЬВЯЦЕЙШУ КРОЎ ПРАЛІЛІ.

ПАСЛЯ ВОСТРАЮ КАРОНУ
НА ТВАЕ УЗЛАЖЫЛІ СКРОНІ,
КАРАЛЁМ НАСЬМЕХ ПРЫБРАЛІ,
ЗЬДЗЕКВАЛІСЯ, ЯК ЖАДАЛІ.

НА ЗЯМЛЮ ПАД КРЫЖАМ ПАДАЎ
І НА ІМ ПРЫБІЦЬ СЯБЕ ДАЎ,
ПРАЦЯРПЕЎШЫ СТРАШНЫ МУКІ,
АДДАЎ ДУШУ БОГУ Ў РУКІ.

БУДЗЬ ЖА ЗА ЎСЕ ПАХВАЛЁНЫ
У МІЛАСЭРДЗЮ НЕСКАНЧОНЫ
ЕЗУ, БОЖА, ХАЙ САРДЭЧНА
ХВАЛІЦЬ ЦЯБЕ Ў НЕБЕ ВЕЧНА.

ПЕСЬНЯ ВЯЛІКОДНАЯ



ВЯСЁЛЫ ДЗЕНЬ ДЛЯ НАС НАСТАЎ,
ЯКОГА ЎВЕСЬ СЬВЕТ ЖАДАЎ;
СЁНЬНЯ ХРЫСТОС З ГРОБУ ЎСТАЎ!
АЛЬЛЕЛЮЯ, АЛЬЛЕЛЮЯ,
АЛЬЛЕЛЮЯ!

А ЯК ХРЫСТОС З МАГІЛЫ ЎСТАЎ,
СВАІХ АПОСТАЛАЎ ВІТАЎ,
ДА МАТКІ АНЁЛАЎ ПАСЛАЎ.
АЛЬЛЕЛЮЯ, АЛЬЛЕЛЮЯ,
АЛЬЛЕЛЮЯ!

УЛАДАР НЯБЕСНЫ К НАМ ПРЫБЫЎ,
ЯК СЬВЕТ НА СОНЕЙКУ ЗАЦЬВІЎ,
ПА СЬМЕРЦІ З НАМІ ЗНОЎ ЗАЖЫЎ!
АЛЬЛЕЛЮЯ, АЛЬЛЕЛЮЯ,
АЛЬЛЕЛЮЯ!

ПЯКЕЛЬНУ НЕТРУ, ЗВАЯВАЎ,
УСЯКІХ ЗЛЫДНЯЎ ПАКАРАЎ,
А ГРЭШНЫМ ЛАСКУ ДАРАВАЎ,
АЛЬЛЕЛЮЯ, АЛЬЛЕЛЮЯ,
АЛЬЛЕЛЮЯ!

ДА ТРОХ ДЗЁН У ПЕКЛЕ ЁН ПРАВЁЎ,
ТАМ ПАЦЯШАЎ СЬВЯТЫХ, АЙЦОЎ,
ПАСЬЛЯ С САБОЮ ІХ ПАВЁЎ.
АЛЬЛЕЛЮЯ, АЛЬЛЕЛЮЯ,
АЛЬЛЕЛЮЯ!

А ТЫЯ, ШТО ДА АДНАГО,
ЯК ЗБАЎЦУ ЎБАЧЫЛІ СВАЙГО,
ЗАГАВАРЫЛІ ДА ЯГО:
АЛЬЛЕЛЮЯ, АЛЬЛЕЛЮЯ,
АЛЬЛЕЛЮЯ!

ВІТАЙ, ЖАДАНЫ НАМ, ВІТАЙ!
О, ХРЫСЬЦЕ, НАС НЕ ПАКІДАЙ,
ЗЬ ПЯПЕЛЬНАЙ МОЦЫ ВЫБАЎЛЯЙ
АЛЬЛЕЛЮЯ, АЛЬЛЕЛЮЯ,
АЛЬЛЕЛЮЯ!

ЯКУЮ Ж РАДАСЦЬ МЕЛІ Ў ЦЬМЕ,
ЯК ЗБАЙЦУ ЎБАЧЫЛІ Ў СЯБЕ,
ЯКОГА ЗДАЎНА ЖДАЛІ ЎСЕ
АЛЬЛЕЛЮЯ, АЛЬЛЕЛЮЯ,
АЛЬЛЕЛЮЯ!

НА ТРЭЦІ ДЗЕНЬ САМ З ГРОБУ ЎСТАЎ,
ПЯЧАЦЯЎ НАТ НЕ ПАЧАПАЎ,
НА СТРАЖАЎ МОЦНЫ СТРАХ НАПАЎ.
АЛЬЛЕЛЮЯ, АЛЬЛЕЛЮЯ,
АЛЬЛЕЛЮЯ!

АНЁЛЫ ВЕРНЫЯ МАЕ!
К ПАНЕНЦЫ ЙДЗІЦЕ ВЫ ХУТЧЭЙ,
К НАЙСЬВЯТШАЙ МАТАЧЦЫ МАЕЙ,
АЛЬЛЕЛЮЯ, АЛЬЛЕЛЮЯ,
АЛЬЛЕЛЮЯ!

ВІТАЙЦЕ ПАННУ АД МЯНЕ,
І ЗАСЬПЯВАЙЦЕ ДЛЯ ЯЕ:
ВІТАЕ ТВОЙ СЫНОК ЦЯБЕ.
АЛЬЛЕЛЮЯ, АЛЬЛЕЛЮЯ,
АЛЬЛЕЛЮЯ!

ПАСЬЛЯ Ў ЯСНАСЬЦІ ТАКОЙ
ДА МАТКІ ЗБЛІЗІЎСЯ СЬВЯТОЙ
І ПРЫВІТАНЬНЕ КАЖА ЁЙ:
АЛЬЛЕЛЮЯ, АЛЬЛЕЛЮЯ,
АЛЬЛЕЛЮЯ!
БУДЗЬ ПОЎНА РАДАСЬЦІ ЎСЯ,
МАТУЛЯ РОДНАЯ МАЯ,
ЖАЛОБА СКОНЧЫЛАСЬ ТВАЯ.
АЛЬЛЕЛЮЯ, АЛЬЛЕЛЮЯ,
АЛЬЛЕЛЮЯ!

ВІТАЙ-ЖА, ЕЗУ МОЙ ЖЫВЫ,
СЫНОК МОЙ, ЛЮБЫ, ЗАЛАТЫ,
ПАЦЕХА УСЯКАЯ ДУШЫ!
АЛЬЛЕЛЮЯ, АЛЬЛЕЛЮЯ,
АЛЬЛЕЛЮЯ!

АХ, ВЕЛЬМІ ВЕСЕЛА ЎЖО МНЕ!
ЖЫВОГА ЎБАЧЫЎШЫ ЦЯБЕ,
ЯК НОВЫМ СЬВЕТ СТАЎ ДЛЯ МЯНЕ
АЛЬЛЕЛЮЯ, АЛЬЛЕЛЮЯ,
АЛЬЛЕЛЮЯ!

ТАК ВЕСЕЛА З ІМ ГАВАРЫЛА,
ЦАЛУЮЧЫ РАНЫ ХРЫСТА
ЗЬ ВЯЛІКІМ ШЧАСЬЦЕМ АДЫШЛА.
АЛЬЛЕЛЮЯ, АЛЬЛЕЛЮЯ,
АЛЬЛЕЛЮЯ!

О, ХРЫСЦЕ, ШТО ЎСТАЎ У ТРЫ ДНІ
ГРАХІ НАМ НАШЫ АДПУСЬЦІ,
ДУШЫ ЗБАЎЛЕНЬНЕ ПРЫНЯСІ!
АЛЬЛЕЛЮЯ, АЛЬЛЕЛЮЯ,
АЛЬЛЕЛЮЯ!

НА БОЖАЕ ЦЕЛА

УВЕСЬ СЬВЕТ, ЗЯ_ МЛЯ І МО_ РА, І ЎСЁ ЖЫ_ВО_ Е Ў ПРАС_ТО_ РЫ

ВЫ_СЛАЎ_ЛЯЙ_ ЦЕ МІ_ЛАСЦЬ БО_ ЖУ,
СЬПЯЁМ Я_ МУ ПЕСЬ_НЮ ХО_ ЖУ, ПЕСЬ_ НЮ ХО_ ЖУ.

БІЦЕ НІЗКА ПАКЛОНЫ
ПРАД ХРЫСТОСАМ УТАЁНЫМ.
У ГЭТАЙ КРЫШОЦЦЫ ХЛЕБА
ЁСЬЦЬ ПРАЎДЗІВЫ БОГ, ПАН НЕБА.

ШТО БЫЎ ЧАЛАВЕКАМ СТАЎСЯ,
ДЗЕЛЯ НАС НА МУКІ ДАЎСЯ
І СКАНАЎ НА ДРЭВЕ КРЫЖА
КАБ ДА НЕБА НАС ПРЫБЛІЖЫЎ.

А ЦЯПЕР ДЛЯ НАС БЯСКОНЦА
СЬВЕЦІЦЬ З ГОСТЫІ ЯК СОНЦА
СТАЎШЫСЯ НАМ ЖЫЦЬЦЯ ХЛЕБАМ
ГРЭШНІКАЎ ЯДНАЕ ЗЬ НЕБАМ.

ДЫК АДЧУЙЦЕ НАШЫ СЭРЦЫ
МОЦ МІЛАСЬЦІ БОГА СТВОРЦЫ
І ДАВАЙЦЯ ЯМУ ХВАЛУ
ЯКОЙ ГОДЗЕН, ДАСКАНАЛЫ.

І АНЁЛЫ, ХЕРУБІМЫ,
І СЬВЯТЫЯ СЕРАФІМЫ
ПРАД ТРОН БОЖЫ УПАДАЙЦЕ
ЯГО МІЛАСЬЦЬ ВЫХВАЛЯЙЦЕ.

А МЫ НІЦ ПРАД ІМ ПАДАЕМ
МІЛАСЭРДДЗЯ УПРАШАЕМ
КАБ ЖЫЦЬЦЁ МЕЦЬ З БОГАМ ПАНАМ
НА ВЕКІ ВЕЧНЫЯ. АМЭН.

ЧЭСЦЬ ТВАЯ, ХВАЛА



ТАБЕ СЁНЬНЯ МЫ — ЛЮД ХРЫШЧОНЫ,
Б'ЁМ ГРАМАДОЮ Ў ПЕСЬНІ ПАКЛОНЫ.

ТВАЙМУ ВЫЛАДАРСТВУ ШЛЮЧЫ
ЗА ГЭТЫ ДАР ТВОЙ УСЕМАГУЧЫ.

ШТО НА НЯГОДНЫХ НАС ДЫ ЎСПОМНІЎ
І Ў САКРАМЭНЦЕ СЯБЕ ЎПРЫТОМНІЎ.

ДЗЕЛЯ НАС, ГРЭШНЫХ, КІНУЎШЫ НЕБА
СКРЫЎСЯ ПАД ВІДАМ ПРОСТАГА ХЛЕБА.

ЦЕЛА ТВАЁ ШТО НА КРЫЖ ПРЫБІЛІ
І ПРАСЬВЯТУЮ КРОЎ, ШТО ПРАЛІЛІ.

НА СЬВЕТ ПРЫЙШОЎШЫ Ў ЛЮДСКАЙ ПОСТАЦІ
МНОГА НЯГОДЫ ВОЛІЎ ДАЗНАЦІ.

ЎРЭШЦЕ З ЛЮБОВІ ДА НАС ВЯЛІКАЙ
ДАЎСЯ НА МУКІ ВАРОЖАСЬЦІ ДЗІКАЙ.

А ЙДУЧЫ Ў НЕБА ДА ВЕЧНАЙ ХВАЛЫ
НАМ ТУТ ПАКІНУЎ ДАР ГЭТЫ СТАЛЫ.

ШТО Ў САКРАМЭНЦЕ БАЧЫЦЕ ГЭТЫМ
З СЭРЦАМ ПАЦЕХАЙ ШЧЫРАЙ САГРЭТЫМ.

ТАБЕ ПЯЁМ МЫ З ЧЫСТАЙ ДУШОЮ,
НЕМА ПАДАЕМ ПЕРАД ТАБОЮ.

ДАЙ ЖА НАМ ЛАСКІ УСЯМОЦНЫ БОЖА,
БО ЧАЛАВЕКУ ХТО ДАПАМОЖА?

ДА МАЦІ БОЖАЙ



ТЫ, ШТО КАРМІЛА
СЬВЕТУ ЗБАЎЛЕНЬНЕ,
І НАМ, ЯК МАЦІ,
ДАЙ ПАЖЫЎЛЕНЬНЕ,
АД ГОЛАДУ НАС НЯХАЙ УКРЫЕ
ТВАЯ АПЕКА — ВІТАЙ МАРЫЯ!

ЧЫСЬЦЕЙША ПАННА,
БЕЗ ЖАДНАЙ СКАЗЫ,
УСЬЦЕРАЖЫ НАС ХВАРОБ, ЗАРАЗЫ,
ТЫ НАЙСТРАЙНЕЙША
РАЙСКА ЛІЛЕЯ
АЧЫСЬЦЬ ПАВЕТРА —
ВІТАЙ МАРЫЯ!

ЦЯЖКІ ЖАЛЬ МЕЛА НАД
СЬМЕРЦЯЙ СЫНА
ПРАЗ ТВАЕ СЬЛЁЗЫ, МАЦІ АДЗІНА,
ХАЙ НАМ ХВІЛІНЫ
СЬМЕРЦІ ЦЯЖКІЯ
СПАКОЙНЫ БУДУЦЬ —
ВІТАЙ МАРЫЯ!

ПОЎНА ПАКОРЫ, ЗГОДНА, ЦІХАЯ,
ДАЙ ЛЮДЗЯМ ЗГОДУ
У НАШЫМ КРАІ;
МІЖ НАС ХАЙ ЗГІНУЦЬ
СВАРКІ ЛІХІЯ,
КРЫЙ НАС АД ВОЙНАЎ —
ВІТАЙ МАРЫЯ!

О, НАЙСЬВЯЦЕЙША,
БЕЗ ЦЕНІ ГРЭХУ,
У КОЖНЫМ ЧАСЕ БУДЗЬ
НАМ ПАЦЕХАЙ;
ХАЙ НАС АПЕКА ТВАЯ ЗАКРЫЕ
АД ГНЕВУ У БОГА —
ВІТАЙ МАРЫЯ!

О, ПАНІ НАША, МІЖ ХЕРУБІМАЎ,
ПАЧУЙ МАЛЕНЬНЕ, НЕБА КНЯГІНЯ
ШТО ЙДЗЕ ПРАЗ СТОПЫ
ТВАЕ СЬВЯТЫЯ,
ЗА НАС МАЛІСЯ — ВІТАЙ МАРЫЯ!

ДА СЭРЦА ЕЗУСА





СЭРЦА ЕЗУСА, ТЫ, ШТО ЗА НАШЫ
ГРАХІ ЦЯЖКІЯ ЗЬ НЕБА ЗЫШЛО,
ЗА ЧАЛАВЕЦТВА
НА МУКІ СТРАШНЫ —
Й СЯБЕ ДЗІДАЙ ПРАБІЦЬ ДАЛО.
ДА ЦЯБЕ ШЛЁМ МЫ
ПРОСЬБЫ СВАЕ,
АДВЯРНІ АД НАС КАРЫ ТВАЕ
СЭРЦА ЕЗУСА,
НАЙБОЛЬШЫ СКАРБ НАШ
МАЙ МІЛАСЭРНАСЬЦЬ
ДЛЯ ГРЭШНЫХ НАС!

СЭРЦА ЕЗУСА,
СМУТНЫМ ДА СКОНУ
З ПРАВІНАЎ СЬВЕТУ
АД РОДУ БЫЛО,
ПРАЗ ЦЯБЕ ЗЬ НЕБА,
З БОЖАГА ТРОНУ,
ЛЮДЗЯМ БЯЗЬМЕРНА
ШЧАСЬЦЕ СПЛЫЛО!
ХТО ТОЛЬКІ ШЧЫРА ЧАГО ЖАДАЎ,
УСЁ ПРАЗ БОЖАЕ СЭРЦА ДАСТАЎ;
СЭРЦА ЕЗУСА
НАЙБОЛЬШЫ СКАРБ НАШ,
МАЙ МІЛАСЭРНАСЬЦЬ
ДЛЯ ГРЭШНЫХ НАС!

СЭРЦА ЕЗУСА, ПАНА НА НЕБЕ,
ПАНУЙ НАД НАМІ
Ў КОЖНАЙ ПАРЫ,
НЯХАЙ ПРЫ ПРАЦЫ,
Ў КОЖНАЙ ПАТРЭБЕ
ДА ЦЯБЕ ЎЗНОСІМ СЭРЦЫ ЎГАРУ.
ДЗЕ ШЧАСЬЦЕ ВЕЧНА,
ДЗЕ СВЕТЛЫ РАЙ,
АХ, БОЖА, ТУДЫ ПАТРАПІЦЬ ДАЙ!
СЭРЦА ЕЗУСА,
НАЙБОЛЬШЫ СКАРБ НАШ
МАЙ МІЛАСЭРНАСЬЦЬ
ДЛЯ ГРЭШНЫХ НАС!

СЭРЦА ЕЗУСА,
ДАЙ ЖА НАМ ЦНОТЫ:
ВЕРУ, НАДЗЕЮ, МІЛАСЬЦЬ К ТАБЕ;
ХАЙ БОГУ СЛУЖЫМ ВЕРНА
З АХВОТАЙ
І ТАК ЗДАБУДЗЕМ НЕБА САБЕ.
АГАДЗЬ НАМ МОЦНА ЎСЯКІ ГРЭХ,
БО ТОЛЬКІ БОСКІХ
ЖАДАЕМ ПАЦЕХ.
СЭРЦА ЕЗУСА,
НАЙБОЛЬШЫ СКАРБ НАШ,
МАЙ МІЛАСЭРНАСЬЦЬ
ДЛЯ ГРЭШНЫХ НАС!

СЭРЦА ЕЗУСА, БУДЗЬ ТАБЕ ХВАЛА
АД УСЯГО НА СЬВЕЦЕ
РОДУ ЛЮДЗЕЙ,
КАБ ЯНА ВЕЧНА НЕ ЗАНІКАЛА,
ДЫ ЎСЬЦЯЖ ПАШЫРАЛАСЬ
НА ЗЯМЛІ ЎСЕЙ.
БУДЗЬ БОГУ ХВАЛА
Ў ТРОЙЦЫ СЬВЯТОЙ,
А НА ЗЯМЛІ ТУТ — НАМ СУПАКОЙ
СЭРЦА ЕЗУСА,
НАЙБОЛЬШЫ СКАРБ НАШ,
МАЙ МІЛАСЭРНАСЬЦЬ
ДЛЯ ГРЭШНЫХ НАС!

МЫ ХОЧАМ БОГА

МЫ ХО_ЧАМ БО_ ГА, ДЗЕ_ ВА МА_ ЦІ, СВА_ ІХ ДЗЯ_ЦЕЙ ПА_СЛУ_ХАЙ

ЗОЎ, МЫ ХО_ЧАМ БО_ ГА ПРА_СЛАЎ_ЛЯ_ ЦІ, Я_ МУ АД_ДАЦЬ ЖЫЦЦЁ І КРОЎ!

БА_ ГА_ СЛА_ВІ НАС МА_ ЦІ, БА_ ГА_ СЛА_ВІ НАШ РОД! МЫ ХОЧАМ

[illegible] СЛАЎ_ ЛЯ_ ЦІ, Я_ ГО_ НЫ ВЕР_ НЫ [illegible] ХОЧАМ

БО[illegible]А ПРА СЛАЎ ЛЯ_ Я [illegible] ВЕР_ НЫ [illegible] НА_РОД!

ХАЙ БУДЗЕ БОГ У СЯМЕЙН[illegible]М [illegible]ОЛІ:
ЖЫЦЬЦІ БАЦЬКОЎ, ДЗІЦЯ[illegible]Х [illegible]НАХ;
ХАЙ БУДЗЕ ЁН У КНІЖЦЫ, ШКОЛЕ,
У АДПАЧЫНКУ, У ПРАЦЫ ДНЯХ.
БАГАСЛАВІ Н[illegible]

МЫ ХОЧАМ БОГА У [illegible] ГОРЫ
ЗАГАДАХ УЛАДЫ, КНІГАХ ПРАЎ
НА ПОЛІ, ГОРАХ І НА МОРЫ
ЗАКОН ЯГОНЫ КАБ НАСТАЎ.
БАГАСЛАВІ НАС, МАЦІ...

МЫ ХОЧАМ БОГА У КОЖНЫМ СТАНЕ,
ЯМУ ПЯЕ КРЫВІЦКІ РОД:
РАБОТНІК, СЕЛЯНІН, МЯШЧА[illegible]Е —
НАШ БЕЛАРУСКІ ЎВЕСЬ НАРОД.
БАГАСЛАВІ НАС, МАЦІ...

М[illegible] ХОЧАМ БОГА У НАШЫМ КРАІ,
М[illegible]АРУСКІХ ДАЎНІХ СТРЭХ
У НАШАЙ МОВЕ І ЗВЫЧАІ
НЯ МОЖА МЕЦІ МЕСЦА ГРЭХ.
[illegible], МАЦІ...

ХАЙ БУДЗЕ БОГ У НАС ЗАЎСЁДЫ:
У ЧАС [illegible]ЛЬЛЯ І Ў СЬЛЯЗАХ,
ХВ[illegible]Х БУРАЎ І НЯЗГОДЫ,
ЖЫЦЬЦІ СПАКОЙНЫМ,
ПРАЦЫ ДНЯХ.
БАГАСЛАВІ НАС, МАЦІ...

МЫ ХОЧАМ БОГА, ЯГО ПРАВА;
ЯГО НАТХНЕНЬНЕ НАШ ПАЧЫ[illegible];
УСЁ ЖЫЦЬЦЁ ЯГОНА СЛАВА;
ЯГО ЗАГАД НАШ КОЖНЫ ЧЫН.
БАГАСЛАВІ НАС, МАЦІ...


БЕЛАРУСКАЯ КАТАЛІЦКАЯ ГРАМАДА
МЕНСК
19